Стрижевич Е.Я.

РАШЭННЕ
калегіі ўпраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама
30.03.2020 № 4

г. Брэст

Аб выніках абласнога тура
XXVIII рэспубліканскага конкурсу
«Бібліятэка – асяродак нацыянальнай
культуры»

Краязнаўства, гісторыка-культурная спадчына з'яўляюцца спрадвечнымі крыніцамі духоўнага ўзбагачэння і замацавання нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. З мэтай узмацнення ролі публічных бібліятэк у гэтым кірунку праз удасканальванне дзейнасці па бібліятэчным краязнаўстве, папулярызацыю нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры, мовы, народнай культуры, падтрымку і развіццё чытання, выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем у вобласці праводзіцца чарговы тур рэспубліканскага штогадовага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

На абласны тур XXVIII рэспубліканскага конкурсу прадставілі 14 матэрыялаў наступныя бібліятэкі вобласці: Баранавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Я.Чачота ДУК «Баранавіцкая РЦБС», Пінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я.Янішчыц ДУК «Пінская РЦБС», Камянецкая цэнтральная раённая бібліятэка імя У.Ігнатоўскага ДУК «Камянецкая РБС», Сялецкая сельская бібліятэка ДУК «Бярозаўская РБС», перасоўная бібліятэка ДУК «Маларыцкая РЦБС», Іванаўская дзіцячая бібліятэка ДУК «ЦРБ імя Ф.Панфёрава», Ляхавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Янкі Купалы ДУК «Ляхавіцкая РЦБС», ДУК «ЦБС г. Баранавічы», Драгічынская цэнтральная раённая бібліятэка ДУК «Драгічынская РЦБС», Ганцавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя В.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая РЦБС», Лунінская сельская бібліятэка ДУК «Лунінецкая РЦБС», Пінская гарадская дзіцячая бібліятэка ДУК «Пінская ГЦБС», Манькавіцкая сельская бібліятэка ДУК «Столінская РБС», Пружанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М.Засіма ДУК «Пружанская ЦБС».

Матэрыялы, прадстаўленыя ў абласны аргкамітэт, уключалі: заяўку, інфармацыйную і аналітычную даведкі, дадаткі ў выглядзе інфармацыйна-бібліяграфічных і аналітычных матэрыялаў, электронных матэрыялаў, метадычных распрацовак, рэкламнай і выдавецкай прадукцыі і г.д.

Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы і заслухаўшы інфармацыю дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М.Горкага Стрыжэвіч А.Я., калегія ўпраўлення культуры ВЫРАШЫЛА:

1. Прызнаць пераможцамі абласнога тура XXVIII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

У намінацыі «За пошукавую і даследчую працу».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

- Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Хваль Ала Уладзіміраўна) – І месца за плённую пошукавую і даследчую працу па захаванні гістарычнай і культурнай спадчыны раёна праз рэалізацыю праекта «Вартыя памяці людской…»;
- Камянецкую цэнтральную раённую бібліятэку імя У.Ігнатоўскага ДУК «Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма» (дырэктар Хухлаева Ларыса Анатольеўна) – ІІ месца за сістэмную і litознабаковую працу па вывучэнні і папулярызацыі гістарычнай спадчыны малой радзімы сярод розных катэгорый чытачоў праз культурна-асветніцкую і праектную дзейнасць.

Сярод сельскіх бібліятэк:

- Лунінскую сельскую бібліятэку ДУК «Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (загадчык Цімашэй Лідзія Кірылаўна) – І месца за плённую пошукавую дзейнасць па даследаванні і папулярызацыі матэрыялаў пра журналіста, пісьменніка і даследчыка М.Еляпеўскага, стварэнне электроннага рэсурсу «Творческие поиски Николая Еленевского»;
- Манькавіцкую сельскую бібліятэку ДУК «Столінская раённая бібліятэчная сістэма» (загадчык Ворах Алена Уладзіміраўна) – ІІ месца за значную работу па зборы і папулярызацыі этнаграфічных, фальклорных, тапанімічных матэрыялаў, стварэнне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў;
- Перасоўную бібліятэку (бібліобус) ДУК «Маларыцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Бурштын Ларыса Мікалаеўна) – ІІІ месца за мэтанакіраваную пошукавую дзейнасць па даследаванні матэрыялаў аб спаленых вёсках Маларытчыны.

У намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

- ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы» (дырэктар Барзілава Алена Аляксандраўна) – І месца за крэатыўны падыход да папулярызацыі здабыткаў нацыянальнай літаратуры, арганізацыю гарадскога конкурсу сярод бібліятэкараў «Папулярызацыя беларускай кнігі і чытання сродкамі інфаграфікі».

Сярод сельскіх бібліятэк:

- Сялецкую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма» (бібліятэкар Ліннік Таццяна Рыгораўна) – І месца за інавацыйны

падыход да папулярызацыі краязнаўчых ведаў і стварэнне віртуальнай літаратурна-краязнаўчай гасцёўні «Вытокі Башты».

У намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання».

Сярод бібліятэк, абслугоўваючых сельскае насельніцтва:

- Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я.Чачота ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Лайша Таццяна Міхайлаўна) – I месца за фарміраванне актыўнага мясцовага культурнага асяроддзя і стварэнне лічбавай медыяпрасторы праз рэалізацыю бібліятэчных праграм «Вяртаем вялікія імёны» і «Адкрываем новыя імёны».

У намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем».

Сярод гарадскіх бібліятэк:

- Іванаўскую дзіцячую бібліятэку ДУК «Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.Панфёрава» (загадчык Мудзь Наталля Пятроўна) – I месца за значны творчы ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем пры дапамозе актыўнай культурна-асветніцкай і інфармацыйнай дзейнасці;
- Пружанскую цэнтральную раённую бібліятэку імя М.Засіма ДУК «Пружанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Гуторкіна Таццяна Рыгораўна) – II месца сярод гарадскіх бібліятэк; за актыўную выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем праз ушанаванне імёнаў знакамітых землякоў і лепшых прадстаўнікоў нацыянальнай культуры.

2. Адзначыць Лістамі падзякі:

- Пінскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Пінская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Анташук Алёна Іванаўна) – за актыўную работу па папулярызацыі творчасці Я.Янішчыц і стварэнне электроннага рэсурсу «Я.І.Янішчыц»;
- Пінскую гарадскую дзіцячую бібліятэку імя Якуба Коласа ГУК «Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (намеснік дырэктара Вакуліч Ірына Уладзіміраўна) – за плённую работу па экалагічным выхаванні падрастаючага пакалення, дзейнасць школы экалогіі «Экоша»;
- Ляхавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Янкі Купалы ДУК «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Пляшэвіч Вольга Анатольеўна) – за сістэмную і мэтанакіраваную работу па далучэнні да чытання розных слаёў насельніцтва, рэалізацыю праекта «Аптэка для душы»;
- Драгічынскую цэнтральную раённую бібліятэку ДУК «Драгічынская раённая цэнтралізаванная бібліятэчная сістэма» (дырэктар Валадкевіч Марына Паўлаўна) – за даследаванне творчага шляху А.І.Дзенісейкі і выданне бібліяграфічнага нарыса «Человек слова и дела…».

3. Пераможцаў абласнога тура XXVIII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ўзнагародзіць Дыпломамі і адзначыць Лістамі падзякі.

4. Прадставіць для ўдзелу ў XXVIII рэспубліканскім конкурсе «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»:

- Ганцавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя В.Праскурава ДУК «Ганцавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;
- Лунінскую сельскую бібліятэку ДУК «Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;
- ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Баранавічы»;
- Сялецкую сельскую бібліятэку ДУК «Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма»;
- Баранавіцкую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я.Чачота ДУК «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;
- Іванаўскую дзіцячую бібліятэку ДУК «Цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.Панфёрава».

5. Кантроль за выкананнем рашэння ўскласці на дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М.Горкага Стрыжэвіч А.Я.

Старшыня калегіі,
начальнік упраўлення культуры
Брэсцкага аблвыканкама С.Б.Панасюк

Стрижевич 57 48 07